*УДК 329.1/.6:32*

# СУЧАСНЫ СТАН ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ: СІМПТОМЫ ЗАНЯПАДУ ЦІ ПРЫКМЕТЫ АДАПТАЦЫІ ДА НОВЫХ ВЫКЛІКАЎ

**М. С. Мамекін**
*Магістр паліталогіі,*
*Выкладчык кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ,Мінск, Беларусь*
*MamekinMS@bsu.by*

Публікацыя прысвечана аналізу сучаснага стана і асаблівасцям функцыянавання палітычных партый у дваццаць першым стагоддзі. Разгледжаны асноўныя палажэнні канцэпцый айчынных і замежных навукоўцаў, якія негатыўна ацэньваюць перпектывы развіцця палітычных партый. Вызначаны далейшыя тэндэнцыі і вектары развіцця палітычных партый.

***Ключавыя словы:*** палітычная партыя; партыйная сістэма; грамадзянская супольнасць; грамадскія рухі; заняпад палітычных партый; картэльныя партыі; партыі “хапай усіх”; кіберпартыі; тэндэнцыі развіцця партый і партыйных сістэм.

# CURRENT STATE OF POLITICAL PARTIES: SYMPTOMS OF DECLINE OR SIGNS OF ADAPTATION TO NEW CHALLENGES

**M. S. Mamekin**
*Master of Political Science, Lecturer, Department of Political Science, Faculty of Law, BSU, Minsk, Belarus*
*MamekinMS@bsu.by*

The publication is devoted to the analysis of the current state and features of the functioning of political parties in the twenty-first century. The main positions of the concepts of domestic and foreign scientists who negatively assess the prospects of the development of political parties are considered. Further trends and vectors of development of political parties are determined.

***Keywords:*** political party; party system; civil society; social movements; decline of political parties; cartel parties; "catch-all- parties"; cyberparties; trends in the development of parties and party systems.

Сучасная дэмакратычная і прававая дзяржава немагчыма без існавання развітай грамадзянскай супольнасці, у надзвычай складанай структуры якой многімі даследчыкамі традыцыйна адзначалася асаблівая роля палітычных партый. Менавіта гэтыя інстытуты грамадзянскай супольнасці доўгі час разглядаліся ў якасці найважнейшага канала перадачы інтарэсаў грамадзянскай супольнасці да дзяржавы. Аднак падобны пазітывісцкі падыход да разумення месца і ролі партый у

палітычнай сістэме грамадства падзяляецца далёка не ўсімі навукоўцамі. З моманту свайго з'яўлення і да нашых дзён палітычныя партыі шматразова станавіліся аб'ектам крытыкі па самых розных падставах, а самому існаванню палітычных партый прадракаўся нядоўгі век. Напрыклад, М. Я. Астрагорскі адзначаў, што пастаянныя партыі ў будучыні будуць распушчаныя, а барацьба за ўладу партыям будзе, безумоўна, забаронена, таму што фармалізацыя палітычнага жыцця, якая ствараецца партыямі, знаходзіцца ў поўнай супярэчнасці з агульнымі прынцыпамі дэмакратыі і інтарэсамі грамадзян [1, с. 163]. Аднак менавіта апошнія дзесяцігоддзі характарызуюцца небывалым ростам публікацый і даследаванняў у духу антыпартыйнай палітычнай традыцыі, многія з якіх абвясцілі канец палітычных партый як інстытута. Сапраўды, якасныя змены сацыяльнай прасторы, што пачаліся ў другой палове дваццатага стагоддзя і працягваюцца па сённяшні дзень, аказалі значны ўплыў на сучасны стан і перспектывы функцыянавання палітычных партый.

Да абставін, якія вызначаюцца ў якасці сімптомаў заняпаду палітычных партый, адносяць: зніжэнне масавасці палітычных партый; паслабленне падтрымкі з боку выбаршчыкаў; зніжэнне яўкі на выбарах і валацільнасць пераваг выбаршчыкаў, размыванне традыцыйных электаратаў, калі грамадзяне накіроўваюцца на выхад з нацыянальнай палітычнай арэны; «старэнне» складу палітычных партый; зніжэнне ідэалагічнага складніка партыйных праграм, што мела вынікам з'яўленне «электаралісцкіх партый», партый «хапай усіх»; размыванне манаполіі традыцыйных партый на прадстаўніцтва інтарэсаў у органах улады, адзначанае ўздымам новых партый і розных палітычных рухаў і арганізацый, адзінай агульнай рысай якіх з'яўляецца непрыманне традыцыйных цэнтраў улады і партый як інстытута; паслабленне значнасці ліберальных каштоўнасцей, дэмакратычных інстытутаў і працэдур; крызіс «жыццёвага цэнтра» і, як следства, уздым папулісцкіх партый; паслабленне ролі «партыйных машын»; адрыў ад выбаршчыка ў выніку залежнасці партый ад дзяржавы і фінансава-прамысловых груп і медыя-холдынгаў, што мела вынікам з'яўленне «картэльных партый»; меншая стабільнасць партый у «новых» партыйных сістэмах; змена «партыйнай дэмакратыі» на «аўдыторную» праз узрастанне ролі СМІ і іншых каналаў камунікацыі з выбаршчыкамі.

У якасці асноўных прычын заняпаду палітычных партый амерыканскі навуковец Э. Хэйвуд называе наступныя: па-першае, тое, што палітычныя партыі «з'яўляюцца (або паўстаюць у вачах грамадства) алігархічнымі структурамі, гэтакімі бюракратычнымі машынамі. Па-другое імідж партый пакутуе і ад іх сувязяў з дзяржавай і прафесійнымі палітыкамі: «свае людзі ў вялікай палітыцы», ужо вельмі многія

партыйныя функцыянеры аказваюцца сапсаванымі уладай, амбіцыямі і карупцыяй – усім тым, што неад'емна ад «высокіх пасад». Партыі, іншымі словамі, ужо не ўспрымаюцца як групы людзей, што выйшлі «з народа»: ва ўсіх іх палітычных справах і справунках простыя людзі не бачаць нічога, акрамя вечнай барацьбы за ўладу. Па-трэцяе, заняпад партый можа быць таксама сімптомам таго, што цяперашнія грамадствы ў прынцыпе становяцца ўсё менш кіраванымі. Чым больш шырокавяшчальна партыі заяўляюць аб сваёй здольнасці вырашыць тыя ці іншыя праблемы, але, атрымаўшы ўладу, не вырашаюць іх, тым больш глыбокае расчараванне яны спараджаюць у грамадстве. Па-чацвёртае, заняпад партый можна звязваць з глыбокай эрозіяй тых грамадскіх адносін, што некалі выклікалі іх да жыцця: ва ўсякім выпадку класавыя адносіны ў эпоху постфардызму ўжо сапраўды становяцца іншымі, як сыходзяць у мінулае і ранейшыя сацыяльныя сувязі» [2].

Яшчэ адным ўплывовым фактарам заняпаду палітычных партый варта лічыць узрастанне ролі СМІ і, у першую чаргу, тэлебачання і Інтэрнэт. За кошт чаго партыі сталі губляць функцыі палітычнай сацыялізацыі мас і прапаганды. Раней асноўнымі метадамі іх барацьбы за выбаршчыка былі ўлёткі, шматлюдныя мітынгі і агітацыя па прынцыпе «ад дзвярэй да дзвярэй». Зараз вялікая частка выбаршчыкаў даведваецца пра партыі і іх кандыдатаў з перадач тэлебачання і Інтэрнэту. Адпаведна і цэнтры агітацыі пераносяцца на тэлеэкраны і сацыяльныя сеткі. Гэтыя факты сведчаць аб тым, што сёння функцыя палітычнай сацыялізацыі і прапаганды размеркавалася галоўным чынам паміж тэлебачаннем, іншымі СМІ, школай і інш. Разам з тым, ускладанне грамадства, павышэнне адукацыйнага ўзроўня насельніцтва, а таксама агульнадаступнасць і альтэрнатыўнасць разнастайных крыніц інфармацыі і СМІ мелі вынікам імкненне найбольш актыўных грамадзян да аўтаномнага палітычнага самавызначэння, што непазбежна сутыкнулася з традыцыйнай для партый тэндэнцыяй «вадзіць людзей за ручку», калі партыі па звычцы навязвалі выбаршчыкам гатовыя, шмат у чым састарэлыя ўзоры мыслення і паводзін. У гэтай сувязі шматлікія грамадзяне, асабліва моладзь, сталі аддаваць перавагу масавым рухам і іншым непартыйным грамадскім утварэнням. Тым самым партыі паступова пачалі губляць функцыю палітычнай мабілізацыі мас. На гэтым фоне зноў-такі адбываецца змяненне зместу і суадносін партыйных функцый, пераход некаторых функцый партый да СМІ і іншых палітычных інстытутаў. Партыі ўсё менш здольныя выконваць функцыі артыкуляцыі, агрэгавання інтарэсаў і вылучэння іх на палітычны парадак дня, а таксама функцыі камунікатара і пасярэдніка паміж грамадствам і дзяржавай.

Разам з тым у жыцці палітычных партый у дваццаць першым стагоддзі адзначаюцца і некаторыя якасна новыя і станоўчыя з'явы і тэндэнцыя, якія сведчаць аб жыццяздольнасці палітычных партый і іх прыстасаванні да новых выклікаў: рост масавасці партый у некаторых новых дэмакратыях: уцягванне ў удзел у палітыцы, у прыватнасці у выбарах, новых слаёў – выбаршчыкаў, што з’яўляюцца прыхільнікамі папулісцкіх партый; запыт на «новую публічнасць» – больш адкрыты стыль камунікацыі палітыкаў з грамадствам дзякуючы развіццю ІКТ, што прывяло да ўзнікнення медыя-партый і кіберпартый; уздым альтэрнатыўных рухаў ліберальнага толку («зялёныя» і да т. п.) як рэакцыя на «новых правых»; «новыя партыі» з першымі поспехамі становяцца больш умераннымі і рэспектабельнымі, а экстрэмізм, таталітарныя замашкі – вельмі маргінальная з'ява.

Сучасныя тэндэнцыі партыйнага развіцця заходніх краін адлюстроўваюць трансфармацыю партый ва ўмовах пераходу да постіндустрыяльнага грамадства. Партыі адаптуюцца да зменаў палітычнага асяроддзя, мадыфікуючы сваю структуру і мадэлі паводзін. Аднак палітычныя партыі па-ранейшаму захоўваюць важную ролю ў рэкрутаванні палітычнай эліты і фарміраванні палітычных лідараў. Ва ўмовах прадстаўнічай дэмакратыі, як найбольш эфектыўнай сістэмы праўлення на гэтым этапе развіцця чалавецтва, партыі рэгулююць і стымулююць электаральны працэс і дзейнасць выбарных органаў. Яны выконваюць працу па адборы і вылучэнні кадраў, прапануюць кандыдатаў, структуруюць выбар выбаршчыкаў, распрацоўваюць альтэрнатыўныя праграмы развіцця краіны і каардынуюць дзейнасць дзяржаўных асоб, якія прадстаўляюць тую ці іншую партыю. Дыскусія аб заняпадзе партый выклікана змяненнем функцый і структуры партый, а не існаваннем партыі як з’явы. Нягледзячы на некатораевідазмяненне партый і партыйных сістэм, партыйнае праўленне застаецца дамінуючай інстытуцыянальнай формай сучаснай дэмакратыі. Партыі і сёння працягваюць адыгрываць ключавую ролю ў палітычным працэсе. У той час як многія іншыя функцыі альбо адміраюць, альбо істотным чынам трансфармуюцца, электаральная функцыя толькі ўзмацняе сваё значэнне, што праяўляецца, у прыватнасці, у практыцы прадастаўлення партыям статусу прывілеяванага суб'екта выбарчага працэсу ў большасці краін свету.

У сувязі з вышэйназванымі акалічнасцямі ў межах сучасных паліталагічных ведаў пазіцыя аб надышоўшым крызісе ў развіцці палітычных партый з’яўляецца недастаткова абгрунтаванай. У сучасным грамадстве функцыянальныя і арганізацыйныя характарыстыкі партый сапраўды істотна змяніліся, але гэта не дае падставаў сцвярджаць аб

сыходзе партый з палітычнай сцэны. У заключэнні варта прывесці выслоўі доктара палітычных навук А. В. Гаман-Галутвінавай: «састарэлі не самі партыі, а хутчэй традыцыйныя ўяўленні аб іх функцыянальным і арганізацыйным прызначэнні».

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Острогорский М.Я.* Демократия и политические партии. М.: РОССПЭН, 1997.
2. *Хэйвуд Э.* Политология: Учебник для студентов вузов / Пер. с англ. под ред. Г. Г. Водолазова, В. Ю. Вельского. М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2005.
3. Дискуссии: современные модели политических партий // Круглые столы посвященные обсуждению перспектив развития партийной системы в России. [Электронный ресурс]. URL: http://samzan.ru/203761 (дата обращения: 21.03.2022).